**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Бурдзялёва, І.* Тэматыка і стылёвая палітра твораў Вінцэся Каратынскага / І. Бурдзялёва // Род. слова. — 2007. — № 6. — С. 9—10.
2. *Бурдзялёва, І.* Стылёвая палітра Вінцэся Каратынскага / І. Бурдзялёва // Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 29 верас. 2006 г. — Мінск : Бел. навука, 2006. — С. 107—113.
3. *Каратынскі, В.* Творы : для ст. шк. узросту / В. Каратынскі ; уклад., прадм. і камент. У. Мархеля. — Мінск : Маст. літ., 2009. — 334 с.
4. *Рагойша, В. П.* Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Бел. навука, 2004. — 576 с.

УДК 821.161.3:8231Марчук

**Я. У. Кавальчук**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# МАТЫЎ СІРОЦТВА Ў РАМАНЕ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА «КВЕТКІ ПРАВІНЦЫІ»

**Уводзіны.** Свет уступіў у XXI стагоддзе, аднак праблема дзяцей-сірот па-ранейшаму актуальная. Сіроцтва як сацыяльная з’ява ўзнікла ў глыбокай старажытнасці. Адлюстраванне гэтай тэмы шырока выяўлена ў вуснай народнай творчасці. Лёсы сірот паказаны ў творах розных жанраў: апавяданнях (Якуб Колас «Сірата Юрка», «Дзеравеншчына», Цётка «Сірата», Уладзіслаў Галубок «Сірата Ганquestо»), аповесцях (Янка Брыль «Сірочы хлеб», Уладзімір Ягоўдзік «Вочы начніцы»), раманах (Георгій Марчук «Кветкі правінцыі»).

Сучасны беларускі пісьменнік Георгій Марчук мае ў сваёй творчай скарбонцы жанрава і тэматычна разнастайныя творы. Самабытнасць і вышыня таленту пісьменніка, глыбіня і непаўторнасць яго душы ўвасобіліся праз каларытнае беларускае слова ў п’есах, аповесцях, апавяданнях, раманах, навелах, афарызмах, канонах, казках, сцэнарыях [1].

Вывучэннем жыцця і творчасці Г. Марчука займаюцца Л. Іконнікава («Творчасць Георгія Марчука: жанравыя асаблівасці, канцэптасфера, мастацкія дамінанты»), З. Прыгодзіч («“Працуй сумленна штодня і поспех знойдзе цябе”: Георгій Марчук»), А. Марціновіч («Сусвет пачынаецца на Палессі столінскім. Георгій Марчук»), В. Заяц («Афарыстычныя выслоўі ў “Давыд-гарадоцкіх канонах” Георгія Марчука»). Даследаванні праведзены А. Белай, У. Навумовічам, Т. Пучынскай, Н. Радзівончык, І. Саверчанкам і інш. Такім чынам, можна гаварыць пра неабходнасць даследавання асобнага аспекту ў творчасці Г. Марчука — матыву сіроцтва на матэрыяле рамана «Кветкі правінцыі».

**Асноўная частка.** У рамане «Кветкі правінцыі» галоўны герой Адась Доля — местачковы хлапчук, які, рана застаўшыся без маці, пакутліва шукае дарогу ў самастойнае жыццё. Персанаж праходзіць складаны шлях маральнага развіцця. Перад чытачом паступова разгортваецца карціна духоўнай эвалюцыі Адася, пачынаючы ад апісання жыцця разгубленага хлопчыка да выяўлення вобраза самадастатковай асобы ў канцы рамана [2].

У імені героя зроблены акцэнт на яго лёсе, жыцці сіраты. Асаблівай сэнсавай згушчанасцю, ушчыльненай канататыўнасцю адзначана прозвішча галоўнага героя рамана — Адася Долі. На сімволіку прозвішча і імя звярталі ўвагу даследчыкі літаратуры. Так, Е. Лявонава адзначае, што імя персанажа выклікае непазбежныя асацыяцыі з біблейскім персанажам. «Адась па-нашаму, па-руску Адам», — патлумачыць маці пры сустрэчы з Крутаяравым [3, с. 20]. Біблейны Адам, створаны Богам паводле свайго вобраза і падабенства, — першы чалавек, родапачынальнік, прабацька, «чалавек у сабе». Відавочна, у семантыцы і імя, і прозвішча героя пазіцыянуецца яго абагульненасць, нацыянальны пачатак сінтэзуецца з універсальным: Адась Доля — гэта мастацкае ўвасабленне чалавека і яго долі/лёсу ў беларускім вырыянце. Па сутнасці, імя і прозвішча героя-апавядальніка ўяўляюць сабой своеасаблівую «згорнутую» канцэптасферу твора [3, с. 20].

Першае і самае складанае выпрабаванне ў жыцці Адася — смерць і пахаванне маці: «Кожны чужы, хто ішоў пагледзець нябожчыцу, не мінаў мяне словамі:

— Бедны сіротка. Бедны сірацінка» [4, с. 14].

Аповед у рамане «Кветкі правінцыі» асвечаны вобразам маці галоўнага героя — Марыі; пад знакам яе жыццёвай драмы адбываецца фарміраванне асобы і характару Адася Долі, яго выхаванне-сталенне. Жудаснай таямніцай, што доўгі час незагойнай ранай трывожыць душу і свядомасць сына, ахутана яе смерць. Менавіта ў гэты момант яна па-сапраўднаму пачынае існаваць для Адася — «як бы наяве», як маці, а не як проста жанчына, звыклая ў сваёй заўсёднай прысутнасці, у няспынным клопаце, ласцы і пяшчоце да сына. «Раптам, — скажа з дзіцячым максімалізмам, з жорсткай бескампраміснасцю да сябе,

© Кавальчук Я. У., 2020



Рэпазіторый БарДУ

сорамам і здзіўленнем Адась, — …я зразумеў, што ў смерці маці, відаць, найбольш вінаваты я сам! Я пачаў шкадаваць яе, мёртвую, як жывую, бо жывую не шкадаваў, бо жывой яна якраз была для мяне як усё роўна мёртвая» [4, с. 16].

Расказваючы пра маці, герой разважае і пра сябе: дзеліцца клопатамі і надзеямі, успамінае дзяцінства, калі «дзень жыцця цягнецца… павольна» і жыццё ўяўляецца вечным; як пасля смерці маці нечакана дазнаецца, што яго бацька, Трыфан Доля, не толькі існуе, але і жыве ў адным з ім мястэчку; разважае над тым, як паступова спасцігаў ён «пісаныя і няпісаныя» законы быцця, нібы «нехта адчыняў нябачныя дзверы» і ўводзіў юнака ў «новы і незвычайны пакой»; як усё больш збіралася ў яго свядомасці і душы свайго, «патаемнага»; як праходзіў праз шматстайныя выпрабаванні; якую ролю адыгрывалі ў яго «выхаванні» розныя людзі — родныя і знаёмыя, блізкія па духу і чужыя [3, с. 18].

Адась-сірата праходзіць праз шматлікія выпрабаванні. Акрамя ранняга сіроцтва, у юнацтве хлопцу давялося спазнаць яшчэ адно няшчасце — хваробу. Г. Марчук увасабляе ідэю сталення, развіцця асобы праз выпрабаванні, якія герой рамана вытрымлівае годна, ён загартоўвае характар, набывае выключную волю да жыцця [2].

Сіроцтва і хвароба прадвызначылі будучыню Адася Долі, загартавалі яго характар, паспрыялі развіццю такіх рысаў, як самастойнасць, грамадская самасвядомасць, чуласць, справядлівасць, навучылі ніколі не спыняцца на паўдарозе, даводзіць пачатае да канца, змагацца за шчасце. Менавіта ў бальніцы і санаторыі хлопец адчуў прыгажосць мастацкага слова, яго выратавальнае ўздзеянне на душу чалавека. Любоў да літаратуры паспрыяла развіццю пісьменніцкага таленту Адася Долі, які ў выніку звязаў з мастацтвам слова далейшае жыццё: «Я ведаю, пра што мне хочацца пісаць. Нясцерпна цягне мяне да стала» [4, с. 256].

Асабліва важна, падкрэслівае аўтар, каб у жыцці сіраты з'явіліся людзі, якія дапамогуць загартаваць характар. Фарміраванне асобы не можа адбывацца адасоблена, без уплыву людзей, што сустракаюцца на шляху героя. У рамане «Кветкі правінцыі» гэта былі «дбайныя, руплівыя, працавітыя, кемлівыя і хітрыя» [4, с. 25] гарадчукі, якія ад прыроды вызначаліся сваімі філасофскімі поглядамі на жыццё. Іх вобразы каларытныя, яркія і запамінальныя. Узаемаадносіны паміж хлопчыкам і акаляючымі яго людзьмі даволі пяшчотныя і прыветлівыя.

Сіроцтва героя Г. Марчука — гэта не толькі цяжкасці, душэўныя перажыванні, але і шчаслівыя моманты ў жыцці. Пераадолеўшы пакуты адзіноты і хваробы, Адась рэалізаваў сябе ва ўласным жыцці: пераехаў у вялікі горад, стварыў сям'ю, стаў пісьменнікам [5].

Наяўнасць «я-героя», запісы ў выглядзе дзённіка згушчаюць эмацыянальны фон твора, узмацняюць гучанне матыву сіроцтва. Вобраз Адася Долі ўвасабляе ідэю выхавання, сталення, развіцця асобы. Герой-сірата праходзіць праз спакушэнні не толькі ўласнай хваробай і смерцю маці, але і каханнем, і вызначальнымі філасофска-інтэлектуальнымі пытаннямі, пошукамі адказаў на іх. Адасю даводзіцца спасцігаць няпростую навуку жыцця. Асабіста-асобаснае выхаванне ўключаецца ў сістэму сацыяльна-грамадскіх зносін. Герой прэтэндуе на ўласны голас, кіруецца жаданнем змяніць ролю «бяскрыўднага прасцяка», «выхаванца», «вучня» на ролю «выхавальніка». «Жыццё бясконцае, няхай шчасціць жывым… Трэба знайсці сілы і смеласць насіць у сабе мінулае, і яно дапаможа не баяцца смерці. Ave vita!» [4, с. 258] — гэтымі радкамі завяршаецца аповед Адася Долі [3, с. 21].

**Заключэнне.** Матыў сіроцтва ў рамане Георгія Марчука «Кветкі правінцыі» рэалізаваны праз хранатоп, які ахоплівае жыццё героя ад маленства да трыццацігадовага ўзросту. Ствараючы аўтабіяграфічны вобраз, пісьменнік адлюстроўвае працэс станаўлення асобы героя. Галоўны персанаж у творы не з'яўляецца поўнай сіратой: побач з ім родныя, блізкія і знаёмыя яму людзі, якія ў хуткім віры жыцця падтрымліваюць Адася, аказваюць на яго станоўчы ўплыў. Інтарэс Г. Марчука выклікае не факт дзяцінства, пакладзены ў аснову твора, а працэс духоўнага прасвятлення, нараджэння чалавека ў чалавеку праз жыццёвыя выпрабаванні, лёс сіроцтва.

Репозиторий БарГУ

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Багамолава, А.* Няма такога чалавека на зямлі, якому бог яшчэ не дапамог / А. Багамолава // Род. слова. — 2009. — № 12. — С. 44.
2. *Пучынская, Т. М.* Аўтабіяграфізм у рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі» / Т. М. Пучынская // Специалист XXI века : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., Барановичи, 22 окт. 2015 г. / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнев, А. В. Прадун (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2015. — С. 264—266.
3. *Лявонава, Е.* Традыцыйнае і новае ў апавядальнай стратэгіі рамана «Кветкі правінцыі» Георгія Марчука / Е. Лявонава // Род. слова. — 2011. — № 10. — С. 17—21.
4. *Марчук Г.* Кветкі правінцыі : раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. — Мінск : Маст. літ, 2004. — 416 с.
5. *Кавальчук, Я. У.* Матыў сіроцтва ў творах сучасных беларускіх пісьменнікаў / Я. У. Кавальчук // Студенческое сообщество и развитие гуманитарных наук в XXI веке : материалы III Междунар. студенч. форума, Воронеж, 17—19 апр. 2019 г. — Воронеж : Издат. дом ВГУ, 2019. — С. 54—56.